Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

29 ЖНІЎНЯ 2017 г. АЎТОРАК №165 (28529)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Дызайнеры з Венеры, заказчыкі з Марса

СТАР. 5



## Рэкі без арэнды

СТАР. 7–8



## Сіла роду. І слабасць забыцця

СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Альбіна ДАВІДОВІЧ, начальнік аддзела дашкольнай адукацыі Міністэрства адукацыі:**

*«Усе ўстановы дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі да пачатку навучальнага года будуць укамплектаваны педагагічнымі кадрамі. Пытання з недахопам педагогаў у дашкольных установах не стаіць. У новым навучальным годзе па ўсёй краіне будзе функцыянаваць 3817 устаноў дашкольнай адукацыі. Яны прымуць 424,6 тысячы выхаванцаў. Дашкольную адукацыю атрымліваюць 95,9% дзяцей ва ўзросце 3—6 гадоў, ва ўзросце 1—6 гадоў — 75,5%. Усе дзеці 5-гадовага ўзросту будуць ахоплены падрыхтоўкай да навучання ў школе. Сёлета сістэма дашкольнай адукацыі чакае папаўнення 16 новымі садкамі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9240 | ▼ |
| Еўра | 2,2954 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0328 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0754 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Лекар старога храма



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Архітэктар і скульптар Мікалай МАЛІНОЎСКІ працуе на архітэктурнай рэстаўрацыі аднаго з найстаражытнейшых помнікаў беларускага дойлідства — Спаса-Праабражэнскай царквы ў жаночым манастыры ў Полацку. Праце амаль дзесяць гадоў. Нароўні з рэстаўратарамі па манументальным роспісе Мікалай Іванавіч вывучае стан сцен і падмуркаў, даследуе кожную цагліну, кожную шчыліну, дае свае навуковыя абрунтаванні і парады, як пры неабходнасці замацаваць сучасны матэрыял, не пашкодзіўшы аўтэнтыку. Сам, уручную, «лечыць» храм XII стагоддзя. Праца рэстаўратараў працягваецца ўжо не першы год, і вынік яе ўжо відаць: большасць каштоўных фрэсак, якія бачыла сама прападобная Еўфрасіння Полацкая, адкрытыя для зацікаўленых позіркаў вернікаў і турыстаў.

■ Ёсць такая прафесія

# Талерка супу... праз акно

## Жыццёвыя байкі прамысловых альпіністаў

**Яны ніколі не хадзілі ў горы, аднак прафесійна караскаюцца па сценах і дахах. Уцяпляюць, фарбуюць, мыюць фасады дамоў летам, збіваюць ледзяшы са стрэх узімку, а здараецца... і ратуюць людзей. Прамысловыя альпіністы працуюць, гадзінамі вісячы на абвязках каля сцен дамоў. Жыхары рэагуюць на іх па-рознаму: хтосьці праз акно талерку супу прапануе, а хтосьці ножыкам спрабуе вяроўку перарэзаць.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Рэакцыя жыхароў на будаўнічых альпіністаў можа быць і такой замілаванай.**

### ДЗЯДУЛЯ З ДУБАЛЬТОЎКАЙ І ГОЛАЯ ДЗЯЎЧЫНА

Штодзённую рызыку на вышыні хлопцы не ўспрымаюць як нешта асаблівае — для іх гэта звычайная праца, якая акрамя грошай прыносіць маральнае задавальненне. У кожнага свая вяроўка, абвязка, сядушка. Альпіністы, як і парашутысты, самі сочаць за станам уласнай амуніцыі. Перад пачаткам работы некалькі разоў пераправераць вузлы, бо ад іх моцы і правільнасці залежыць жыццё, асабліва калі пад табой 60 метраў паветра (вышыня 20-павярховіка).

— *Няважна, другі гэта паверх ці 20-ы. Перад табой проста сцяна, і ты робіш сваю працу,* — кажа **Дзмітрый КАЗІМІРСКІ, альпініст з 14-гадовым стажам.** — *Мы звыкліся да вышыні і ўспрымаем яе па прынцыпе «проста даўжэй спускацца». Аднак той, хто не баіцца, — дурань.*

СТАР. 4

■ Перспектыва

# «ВЫЛЕТ ДАЗВАЛЯЮ!»

## У Брэсце спадзяюцца, што пасля рэканструкцыі ўзлётна-пасадачнай паласы аэрапорта гэта каманда будзе гучаць часцей

**Цяпер такое нават уявіць не проста: з Брэста ажыццяўляліся рэгулярныя авіяпералёты ў Маскву, Адэсу, Сімферопаль, Запарожжа, Кіеў, Кішынёў, Мінск. Рэйсы на Маскву выконваліся некалькі разоў у суткі, штодзённымі былі вылеты ў Кіеў, Днепрапятроўск, Мінеральныя Воды. А ў 1991 годзе адкрылася самая працяглая лінія Аэрафлоту: Брэст—Чэлябінск—Новасібірск—Чыта—Уладзівасток.**

«Знайшла што ўспомніць!» — скажа прыдзірлівы чытач. — На пачатку 80-х гадоў была ўзведзена ўзлётная паласа і абсталяваны аэрадром каля вёскі Моталь. І толькі зараджэнне крызісу ў эканоміцы перашкодзіла наладзіць рэгулярныя рэйсы паміж сталіцай і адным з самых цікавых населеных пунктаў Палесся... І ўсё ж гісторыю варта згадаць у кантэксце Брэсцкай паветранай гавані. Першы аэрадром у Брэсце паявіўся ў 1901 годзе і быў ваенным аб'ектам, а ў 1945 годзе стаў аб'ектам грамадзянскай авіяцыі. Размяшчаўся ён у рысе цяперашняга горада, тое месца па-ранейшаму ў народзе называюць «старым аэрапортам».

СТАР. 5